# Мяснікоў Анатоль
# (1950-2011)



Мяснікоў Анатоль Фёдаравіч — беларускі гісторык, літаратар, публіцыст.

Нарадзіўся 15 ліпеня 1950 года ў в. Шмідзельшчына Талачынскага раёна ў сялянскай сям'і.

Скончыў Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт (1972г.). Працаваў у газетах “Чырвоная змена”, “Звязда” (з 1978 года). Кандыдат гістарычных навук (1987г.).

У 1994 годзе ўзнагароджаны Дзяржаўнай прэміяй Беларусі за кнігу “Нацдэмы: лёс і трагедыя Фабіяна Шантыра, Усевалада Ігнатоўскага і Язэпа Лёсіка” (1993г.).

З 1995 года — прэс-сакратар Старшыні Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь. У 1996–1999 гг. працаваў галоўным рэдактарам часопіса “Гуманітарна-эканамічны веснік”.

З 1976 года — член Саюза журналістаў рэспублікі, з 2001 года — член Саюза беларускіх пісьменнікаў.

З 2007 года — загадчык кафедры Інстытута парламентарызму і прадпрымальніцтва.

Даследаваў гісторыю Беларусі XIX–XX стст., праблемы беларускай журналістыкі і міжнацыянальных адносін у Рэспубліцы Беларусь.

Аўтар кніг: “Сацыялістычнае спаборніцтва і друк Беларусі” (1980г.), “Айчыне адданыя сыны: гістарычныя нарысы” (1997г.), “Дзеля гэтага варта жыць: публіцыстыка, дыялогі, эсэ” (2000г.), “Гісторыя Беларусі: ад старажытнасці да нашых дзён” (2004г.), “Вялікая Айчынная вайна савецкага народа (у кантэксце Другой сусветнай вайны)” (2005г.), “Талент быць чалавекам” (2005г., сумесна з Г. І. Аўсянкінай), “Сто асоб беларускай гісторыі” (2-е выд., 2009г.), “Сто асоб беларускага спорту” (2009г.).

У 2010 годзе атрымаў Рэспубліканскую прэмію “Залаты купідон” за кнігу дакументальных аповесцей і нарысаў пра Я. А. Адамовіча, А. Л. Бурбіса, Д. Ф. Прышчэпава, А. А. Смоліча, І. П. Убарэвіча, М. С. Чарота, А. Г. Чарвякова і інш.

Памёр 21 красавіка 2011 года.

## Дадатковыя матэрыялы
## аб жыцці і дзейнасці:


1. **Давідовіч, В.В.** Мяснікоў Анатоль Фёдаравіч / В.В. Давідовіч // Культура Беларусі : энцыклапедыя : [у 6 т.] / рэдкал. : У.У. Андрыевіч і інш. — Мінск : БелЭн імя П. Броўкі, 2015. — Т. 6 : М–Я. — С. 22.
2. **Карніловіч, Э.** Пароднены з газетай “Звязда” / Эдуард Карніловіч // Наша Талачыншчына. — 2013. — 18 верасня. — С. 7.
3. **Марціновіч, А.** Каб менела ў гісторыі загадак / Алесь Марціновіч // Літаратура і мастацтва. — 2011. — 27 мая. — С. 22.
4. **Мясников Анатолий Фёдорович** // Регионы Беларуси : энциклопедия : в 7 т. / редкол. : Т.В. Белова [и др.]. — Минск : БелЭн імя П. Броўкі, 2011. — Т. 2 : Витебская область : в 2 кн. — Кн. 2. — С. 153.
5. **Мясников Анатолий Фёдорович** // Республика Беларусь : энциклопедия : [в 7 т.] / редкол. : Г.П. Пашков [и др.]. — Минск : БелЭн імя П. Броўкі, 2007. — Т. 5 : Минск–Педиатрия. — С. 282.
6. **Мяснікоў Анатоль Фёдаравіч** // Беларуская энцыклапедыя : у 18 т. / рэдкал. : Г.П. Пашкоў [і інш.]. — Мінск : БелЭн, 2004. — Т. 18. Кн. 1 : Дадатак : Шчытнікі–Яя. — С. 431.
7. **Публицист, краевед, исследователь** // Моя Толочинщина: страницы истории / Анатолий Шнейдер. — 2-е изд, с изм. — Минск : Бизнесофсет, 2006. — С. 136–137.
8. **Шнэйдар, А.** Заўсёды ў пошуку / Анатоль Шнэйдар // Наша Талачыншчына. — 2004. — 11 жніўня. — С. 2.


## Інтэрнэт-рэсурсы:


1. **Мяснікоў Анатоль Фёдаравіч** : [Электронны рэсурс]. — Рэжым доступу : http://pridvinie.vlib.by/index.php/mtree-lib/pismenniki-paety-litaratary/myasniko-anatol-fjodaravich. — Дата доступу : 01.11.2022.